# УСТОЙЛІВЫЯ ВЫРАЗЫ Ў МОВЕ МАСТАЦКАГА ТВОРА ("СЯЛЯНКА" В.ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА)

**Н.В. Філімонава**

Для п'есы "Сялянка" В.Дуніна-Марцінкевіча характэрна творчае выкарыстанне прыказак і прымавак. З іх дапамогай аўтар стварае каларытныя вобразы сялян (Наум, Ціт), дае каштоўны матэрыял для разумення псіхалогіі, філасофіі працоўнага чалавека. Прыказкі і прымаўкі арганічна ўпісваюцца ў тэкст і звяртаюць на сябе ўвагу.

"Прыказка ўяўляе сабой глыбокае па думцы, сціслае па форме гатовае выслоўе, у якім абагулены вялікі народны вопыт, сцвярджаецца важная філасофская думка, робіцца глыбокі вывад, даецца правіла" [ I, 7 ].

Можна вылучыць асноўныя тэматычныя групы прыказак, якія аўтар уводзіць у твор: цяжкая доля беларускага селяніна (*да бога высока, да пана далёка; гдзе толькі мужык з слаўцом, там за нім пуга з вузлом; пакуль сонца ўзойдзе, раса вочы выесць; і адсюль гарачо, і адтуль балячо*), сіла і права (*калі маеш грошы, то не будзеш босы; скора едзе той, хто мажа*); справядлівасць, выкрыццё дрэнных учынкаў (*да пары збан ваду нёс; не ўтаіш шыла ў ворку; над сіратою Бог з калітою; цягаў воўк, пацяглі воўка*); погляд на жанчыну (*куды чорт не даступіцца, туды бабу пашлець; жонку любі, як душу, а трасі, як*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*грушу*); каханне і вяселле (*суджанага ды ражанага і канём не аб'едзеш; маўчу, пэўне замуж хачу; хто каго любіць, той таго чубіць*) і інш.

Прыказкі дапамагаюць зазірнуць ва ўнутраны свет чалавека, які з'яўляецца носьбітам маральных норм і творцам матэрыяльных каштоўнасцей. У лаканічнай, сціслай прыказцы змяшчаецца глыбокая думка, філасофскі погляд чалавека на жыццё.

У прыказках шмат агульнага з прымаўкамі: яны не ствараюцца ў працэсе моўных зносін, а скарыстоўваюцца ў гатовым выглядзе, заўсёды імкнуцца да сцісласці. Але "калі прыказка вучыць, уводзіць думку ў ступень усеагульнага правіла, настойвае на справядлівасці сцверджання і часта мае форму катэгарычнага вываду, загаду або адмаўлення, то прымаўка ўяўляе гатовае выслоўе для вобразна-эмацыянальнай ацэнкі прадмета і служыць сродкам упрыгожвання мовы" I, 8 ]

У п'есе "Сялянка" мы знойдзем ілюстрацыю прымавак, якія выконваюць мастацка-эстэтычныя функцыі: перадаюць асаблівасці характару людзей, іх душэўны стан, эмацыянальна ацэньваюць іх учынкі: *куды еду, туды еду, да ўсё карчмы не міну, не піў – не мог, а выпіў – ні рук, ні ног; мужык, як варона, а хіцёр, як чорт; як умее, так і пее; мая душа не крывая, усё прымае.* З дапамогай прымавак аўтар дае чытачу ўяўленне аб героях твора – сялянах, характарызуе іх з адмоўнага боку (схільнасць да п'янства) і з дадатнага (кемлівасць, знаходлівасць).

У мастацкай арганізацыі прыказак і прымавак вялікая роля прыпадае на рыфму і рытм, чым яны вылучаюцца на фоне празаічнага тэксту: *і адсюль гарачо, і адтуль балячо; ты з варот, а ён чэраз плот; і бога хвалі, і чарта не гнявi* і інш.

Рыфма перш за ўсё акцэнтуе ўвагу на сэнсава важных словах. У адных выпадках рыфмуюцца сумежныя словы першай часткі, а другая пакідаецца без сугучча. Тым самым яна як бы процістаўіцца першай: *аб воўку памоўка, а ён тут; ад ліха ціха, а дабра не чуваць.* У другіх, найбольш частых выпадках рыфмай падкрэсліваюцца, супастаўляюцца або параўноўваюцца канцовыя словы: *хто каго любіць, той таго чубіць; гдзе толькі мужык з слаўцом, там за ім пуга з вузлом* і інш.

Многім прыказкам і прымаўкам, выкарыстаным у п'есе "Сялянка", характэрны гукапіс: *мужык п'ець, як у леечку льець, а як прыдзецца плаціць, то, як дурань, маўчыць; паньска міласць, жончына вернасць, дружба жыдоўская – усё чартоўскае; і адсюль гарачо, і адтуль балячо* і г.д.

Рыфма, рытм, алітэрацыя і асананс засцерагаюць прыказкі і прымаўкі ад разбурэння, надаюць ім інтанацыйную завершанасць.

Як можна заўважыць, даволі часта ў прыказках і прымаўках, уведзеных аўтарам у тканіну твора, для ўзмацнення афарыстычнасці, надання ім мілагучнасці і экспрэсіўнасці скарыстоўваюцца прыёмы антытэзы і паралелізму: *любіў добрае, палюбі ж і злое; кінь назад, а знойдзеш перад сабою; ранняя пташачка крылкі цярэбіць, а позняя вочы паціраe; воран ворану вачэй не выклюе, пан з панам пазнаецца; якое дрэва, такі клін, які бацька, такі сын* і інш. Некаторыя прыказкі і прымаўкі ўтрымліваюць у сабе кампаненты-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сінонімы: *і адсюль гарачо, і адтуль балячо; горш, калі баішся, і ліха не мінеш, і надрыжышся* і інш.

Мастацкая арганізацыя многіх прыказак і прымавак уключае ў сябе параўнанне, што можна праілюстраваць матэрыялам п'есы В.Дуніна-Марцінкевіча: *мужык п'ець, як у леечку льець, а як прыдзецца плаціць, то, як дурань, маўчыць; мужык, як варона, а хіцёр, як чорт; жонку любі, як душу, а трасі, як грушу*.

Прыказкі і прымаўкі нясуць агульначалавечую мараль, выказаную сцісла, у дасканалай форме, таму яны не старэюць на працягу многіх стагоддзяў і не страчваюць актуальнасці, жыццёвасці.

Многія адметныя рысы паэтыкі пісьменніка склаліся пад уплывам вобразнасці, сцісласці, трапнасці прыказак і прымавак, якія арганічна ўпісваюцца ў тэкст і дапамагаюць дакладна вымалёўваць характары персанажаў, індывідуалізаваць іх мову, перадаваць жыццёвы вопыт, духоўны скарб народа.

Аналіз устойлівых выразаў п'есы "Сялянка" В.Дуніна-Марцінкевіча сведчыць аб тым, што аўтар кіраваўся ў адборы лексічных сродкаў жывым маўленнем, дакладным адлюстраваннем мовы прадстаўнікоў сялянства і, безумоўна, стылістычнымі мэтамі як мастак слова.

Літаратура:

1. Шкраба І., Шкраба Р. Крынічнае слова: Беларускія прыказкі і прымаўкі. Мн., 1987.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ